**А. В. Брадзіхіна**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ТЭСТ ЯК ФОРМА КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў СІСТЭМЕ СЯРЭДНЯЙ І ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ: ПЕРАВАГІ І НЕДАХОПЫ

Тэставая форма кантролю атрымала шырокае ўкараненне ў практыцы сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў Беларусі ў 90-я гг. XX стагоддзя, што выклікана найперш распаўсюджаннем здабыткаў папулярных у Еўропе і ЗША сучасных адукацыйных тэхналогій, а затым – увядзеннем у нашай краіне ЦТ (цэнтралізаванага тэсціравання). Прыдатны найперш для засваення навук тэхнічнага і прыродазначўчага цыклаў, тэст як форма кантролю ведаў шырока выкарыстоўваецца і пры вывучэнні гуманітарных дысцыплін. Мэтай дадзенай працы якраз і з’яўляецца ацэнка валіднасці прымянення тэставых методык пры засваенні гісторыі беларускай літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе.

Безумоўна, тэставыя заданні маюць шмат пераваг перад іншымі формамі кантролю, пра што неаднаразова зазначалася метадыстамі. Маецца на ўвазе найперш эканомія часу, бо тэст забяспечвае аператыўнасць праверкі задання педагогам, дазваляе ацаніць якасць засваення навучэнцамвялікай колькасці інфармацыі, а таксама высветліць лакуны ў яго ведах. Акрамя таго, тэсціраванне дае апошняму магчымасць самаправеркі, дапамагае наглядна і ўсвядомлена ацаніць уласны ўзровень засваення тэмы, а настаўніку – адначасова апытаць вялікую колькасць вучняў, разнастаіць адукацыйны працэс і статыстычна апрацаваць вынікі для далейшага аналізу сваёй педагагічнай дзейнасці і ўдасканалення методыкі выкладання прадмета. Да плюсаў гэтай формы кантролю можна далучыць і выключэнне суб’ектыўнасці пры ацэнцы ведаў выкладчыкам, мінімізацыя яго ролі, пры ўмове, натуральна, якаснасці прапанаваных заданняў і адэкватнай дыферэнцыяцыі ўзроўню іх складанасці.

Так, да асноўных патрабаванняў да фармуліроўкі пытанняў тэста варта далучыць адсутнасць метафарычнасці, двухсэнсоўнасці, няяснасці, уключэнне непраўдападобных варыянтаў адказаў. Наступная праблема – ацаніць ступень цяжкасці і, адпаведна, балаў па кожным заданні. Паводле складанасці мысленчых аперацый яны размяркоўваюцца ў наступным парадку: заданні з выбарам аднаго ці некалькіх правільных адказаў; заданні па прынцыпу выключэння,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на суадносіны ці парадак з'яў; тэсты адкрытага тыпу. Прычым, ствараючы тэст, пажадана ўлічваць усе віды указаных вышэй пытанняў.

Да прыкладу, заданне па прынцыпу выключэння можа выглядаць наступным чынам:

Якія рысы не ўласцівы літаратуры Сярэднявечча?

а) службова-прыкладное прызначэнне;

б) ананімнасць;

в) свецкі характар;

г) колькасная перавага перакладных твораў над арыгінальнымі.

Аднак тэставы кантроль мае шэраг недахопаў. У дачыненні да такой дысцыпліны, як літаратура, беларуская ў прыватнасці, найперш гэта магчымасць праверыць толькі рэпрадуктыўныя веды. А таму сёння метадысты-філолагі амаль адзінадушна пагаджаюцца, прызнаючы тэставы кантроль неэфектыўным пры вывучэнні гэтай дысцыпліны ў сярэдняй школе.

Справа ў тым, што крытэрыі якасці літаратурнай адукацыі палягаюць у плоскасці дакладных ведаў толькі часткова (веданне тэарэтычных паняццяў, біяграфій пісьменнікаў, элементаў паэтыкі мастацкага тэксту, агульных заканамернасцей развіцця літаратурнага працэсу і інш.).

Спасціжэнне вербальнага мастацтва ў параўнанні з іншымі дысцыплінамі патрабуе ад вучняў найперш дыялектычнага мыслення, эстэтычнага густу, інтэрпрэтацыі мастацкіх тэкстаў і іх аналізу ў адзінстве філасофскіх, аксіялагічных, маральных аспектаў, урэшце, моўнай культуры, узровень развіцця якіх немагчыма сфарміраваць і праверыць праз самыя дасканалыя тэсты.

Пытанне эфектыўнасці тэставага кантролю становіцца краевугольным каменем у навучальным працэсе вышэйшай школы, бо гісторыя літаратуры ў сістэме ўніверсітэцкай філалагічнай адукацыі з'яўляецца профільнай дысцыплінай, непасрэдна звязанай з прафесійнай кампетэнтнасцю будучага спецыяліста.

Паспрабуем ацаніць валіднасць тэсціравання ў якасці экзаменацыйнага задання па прадмеце. Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь спецыяльнасці «Беларуская філалогія» (па напрамках) – АСВА І-21 05 01-2013–прад'яўляе шэраг патрабаванняў да атэстацыі студэнтаў па згаданай вышэй дысцыпліне, якія прадугледжваюць набыццё (фарміраванне і развіццё) наступных кампетэнцый:

**«6.2 Патрабаванні да акадэмічнай кампетэнцыі спецыяліста**

Спецыяліст павінен:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна. <…>

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем.<…>

АК-8. Мець навыкі вуснай і пісьмовай камунікацыі.<…>

**6.3. Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста**

Спецыяліст павінен:

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.<…>

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.<…>

**6.4 Патрабаванні да прафесійнайкампетэнтнасці спецыяліста**

Спецыяліст павінен быць здольны:

**Навукова-педагагічная і вучэбна-метадычнаядзейнасць**<…>

ПК-2. Выкарыстоўваць розныятэхналогіі навучання мове і літаратуры.<…>

**Навукова-даследчая дзейнасць**<…>

ПК-8. Прадстаўляць вынікі навуковай працы ў адпаведнасці з адпаведнымі патрабаваннямі.<…>

**Праектная дзейнасць**<…>

ПК-12. Праводзіць аналіз праектнай дзейнасці ў гуманітарнай сферы, распрацоўваць прапановы па навышэнні эфектыўнасці запланаваных доследаў.

**Арганізацыйна-кіруючая дзейнасць**

ПК-13. Арганізоўваць працу малых калектываў выканаўцаў для дасягнення пастаўленых мэт.<…>

ПК-23. Праводзіць доследы, заснаваныя на інавацыйных тэхналогіях і методыках» [1, с. 8–9].

Як бачым, з дапамогай тэставага кантролю можна праверыць сфарміраванасць выключна адной кампетэнцыі – АК-4;АК-1,АК-6 і САК-5– толькі часткова, а большасць кампетэнцый – АК-2,3,8; САК-1,ПК-2,8,12,13,23– увогуле немагчыма.

Іншымі словамі, уводзячы тэставую форму кантролю на ўніверсітэцкіх экзаменах па гісторыі беларускай літаратуры як абавязковую, мы апынаемся ў сітуацыі, якая дэманструе недастатковае разуменне канкрэтных адукацыйных задач, што стаяць перад выкладчыкам, і неадпаведнасць віду дзеяння студэнтаў якаснаму

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

фарміраванню неабходных кампетэнцый, прадугледжаных Адукацыйным стандартам.

Больш за тое, універсальныя вартасці такой формы кантролю ў гэтым выпадку абарочваюцца яе недахопамі. Так, эканомія часу студэнта і педагога як безумоўны плюс прымянення тэсціраваннястрачваецца, бо тэрмін правядзення экзамену істотна павялічваецца пры ўмове абавязковай камбінацыі тэставай і вусна-пісьмовай форм кантролю.

Аб'ектыўнасць ацэнкі ў выніку тэставага кантролю абвяргаецца не толькі магчымасцю выпадковасці пры выбары студэнтам адказаўнаўздагад, калі ён не валодае матэрыялам, але і змяшчэннем акцэнтаў на другарадныя, усяго толькі дапаможныя, веды і ўменніпры вывучэнні літаратуры (змест твора, гісторыю яго напісання, вызначаны пісьменнікам ці крытыкамі жанр і да т. п.).

Выкарыстанне камп'ютарных тэстаў яшчэ больш ускладняе сітуацыю аб'ектыўнай ацэнкі ведаў студэнта па гісторыі ці нават тэорыі літаратуры, хаця пры вывучэнні такіх дысцыплін, як «Уводзіны ў літаратуразнаўства» ці «Тэорыя літаратуры», мае большы патэнцыял для прымяннення, аднак таксама не гарантуе поўнай адэкватнасці ацэнкі.

Па-першае, камп'ютарнае тэсціраванне ў большасці выпадкаў выключае магчымасць адкрытай формы тэставага задання, якая лічыцца найбольш складанай і, адпаведна, важнай для атрымання студэнтам высокай адзнакі.Аднак толькі такі від пытанняў хаця б у невялікай ступені надае тэсту эўрыстычны характар.

Па-другое, камп'ютар прадугледжвае строгую фармуліроўку адказу, што ў выпадку з дысцыплінамі літаратуразнаўчага цыкла нярэдка немагчымая нават у выпадку з тэрмінамі, бо правільнасць адказу залежыць ад інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту. Так, скажам, у вершы С. Грахоўскага «Ветразь» («У выраі ветразь знікае…») ветразь можа быць успрыняты і як сінекдаха (човен), і як метанімія (нехта ў чоўне), і як метафара (нехта ў моры жыцця).

Такім чынам, тэст з'яўляецца адной з найменей эфектыўных форм ацэнкі ведаў пры правядзенні экзамену па гісторыі беларускай літаратуры як у сярэдняй школе, так і ў ВНУ, але прымальнай пры бягучым кантролі пэўных тэм пры ўмове якаснага зместу пытанняў і выкарыстанняўсіх іх тыпаў, у тым ліку адкрытых. У сувязі з гэтым варта адзначыць, што форму правядзення экзамену па канкрэтнай літаратуразнаўчай дысцыпліне можа (і павінна) кампетэнтна абраць профільная кафедра.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць1-21 05 01-2013 Ббеларуская філалогія (па напрамках): АСВАІ-21 05 01-2013. Уведз. 30.08.2013. – Мінск : М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь: РИВШ, 2013. – 32 с.